А. С. Гаркуша К. В. Данілава

# ГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ Ў РАМАНАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Гісторыя цікавіла Караткевіча пераважна як прытча, легенда і ў тым плане, які ўплыў зрабіла яна на духоўнае жыццё народа, на яго грамадскую свядомасць. Пісьменніку характэрна рамантычнае, фальклорна-легендарнае асэнсаванне мінуўшчыны. Паэтызуючы гісторыю, уздымаў пытанні, актуальныя для сённяшняга дня. Уладзімір Караткевіч — пісьменнік з выразна выяўленым лірычна-рамантычным талентам. У гістарычных рэчах ён, ствараючы дасканалыя малюнкі мінуўшчыны, гістарычныя калізіі часцей за ўсё перамяшчае ў сферу рамантычнага канфлікту чалавечнасці, высакароднасці з жорсткасцю, эгаізмам, духоўнай чэрствасцю, цынізмам. Праз творы У.Караткевіча мы далучаемся да гісторыі нашай краіны, у іх прысутнічаюць гістарычныя падзеі розных часоу: ад пачатку стварэння Вялікага Княства Літоўскага да зусім недауняга мінулага. Героі У. Караткевіча свабодна пераходзяць з аднаго гістарычнага перыяду ў іншы, што абумоўлівае спецыфічную арганізацыю твораў на структурным узроўні. Дзейнічаюць у іншым часе прывідныя коннікі караля Стаха (аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»). Не адпускае мінулае і герояў рамана «Чорны замак Альшанскі». Як трапна заўважае Антон Косміч, той, «хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае – асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў». Мінулае ў разуменні пісьменніка не толькі ўплывае на сучаснае: мінулае як бы працягваецца ў сучаснасці, становіцца яе неад'емнай часткай. Аўтар усведамляе выразную мяжу паміж гэтымі часовымі пластамі, аднак наўмысна паказвае іх злітна. Такое бачанне гісторыі стала наватарскім у беларускай прозе: часова аддалены, працэсуальна завершаны этап мінулага знаходзіць свой працяг у сучаснасці. Праз перакрыжаванне розных гістарычных перыядаў Уладзімір Караткевіч паглыблена асэнсоўвае мінулае: кантраснае супастаўленне розных гістарычных момантаў дазваляе раскрыць новы змест у мінулым, які яшчэ не быў прадметам мастацкага адлюстравання ў рамантычна-асветніцкай традыцыі. Рамантычнае і фантастычнае, прыгодніцкае і дэтэктыўнае ў яго творах не самамэта, не толькі для таго, каб чыталі яго кнігі і на роднай мове. Вывучаючы і даследуючы старонкі гісторыі, У. Караткевіч найперш для сябе зрабіў адкрыццё, што ў нашым мінулым ёсць адказы на пытанні, якія не толькі хвалююць нас сёння, а ад вырашэння якіх залежыць, ці будзем мы «людзьмі звацца». Дзякуючы яго кнігам, мы можам адказаць і на Купалава пытанне, «скуль, якога мы роду». Мы — народ, мы — нацыя не горшая за іншыя, у нас ёсць свае карані, а ў нашым мінулым — не толькі гаротнае, трагічнае, але і гераічнае, вартае гонару і захаплення, здрадзіць якому — не мець світання. Нельга не здзіўляцца таму, колькі старонак гісторыі прачытана Уладзімірам Караткевічам для нас, колькі «белых плямаў» зліквідавана, — і ўсё дзеля таго, каб вярнуць нам памяць, бо без памяці нам не быць... Сапраўды, як ён сам казаў, вякі яго спяваюць ротам. Уладзімір Караткевіч стварыў у літаратуры нашу гісторыю, стварыў наша мінулае, з яго лёгкай рукі вякі загаварылі з намі як добрыя субяседнікі, цікава і даходліва. Дык няхай жа гэта размова працягваецца на вякі як памяць аб мастаку рэдкай і непаўторнай сілы, рыцару духу Уладзіміру Караткевічу.

### *Список литературы*


1. Андраюк С. Беларусь – яго песня // Чырвоная змена. 26 лістап. 1980. С. 4.
2. Верабей А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творч. У. Караткевіча. Мінск, 1997. 256 с., [8] л. іл
3. Караткевіч У. Збор твораў у васьмі тамах. Мінск, 1987 –1991.
4. Ліс А. С. Годна, з любасцю // Ліс А. С. Цяжкая дарога свабоды. Мінск, 1994. С. 394 –413.


*Гаркуша А.С*, студэнтка 1 курса ФІТіК БДУІР.
*Данілава К.В.*, студэнтка 1 курса ФІТіК БДУІР.
*Навуковы кіраўнік: Мякіньская А.У.*, выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін